Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

14 ЛІПЕНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 134 (30014)

НЕ ТРАПІЦЬ НА ВУДАЧКУ... МАХЛЯРА 13

ПРЫПЯЧЭ ДА 33 ГРАДУСАЎ 16

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый ПІНЕВІЧ, міністр аховы здароўя:

«Ва ўмовах глабалізацыі і кратнага павелічэння камунікатыўных сувязяў рознага ўзроўню інфекцыйныя захворванні могуць распаўсюджвацца хутчэй у межах і за межамі краін. Праблемы біябяспекі прыцягваюць усеагульную ўвагу з-за ўзрослых асцярог наконт наўмысных біялагічных інцыдэнтаў і новых біялагічных пагроз натуральнага і штучнага характару, якія ўзнікаюць. Існуючыя рызыкі значнага біялагічнага інцыдэнту будуць і ў далейшым узмацняцца хуткім прагрэсам у тэхналогіях, якія могуць садзейнічаць мадыфікацыі або стварэнню патагенаў з пандэмічным патэнцыялам. Гэта патрабуе глабальных і канкрэтных дзеянняў для кантролю за біябяспекай лабараторый і тэхналогій».

КАРАТКА

- У Беларусі намалацілі амаль 400 тысяч тон азімага ячменю.

- Краіны СНД працуюць над праектам пагаднення аб пагранічнай бяспецы.
- Ліга канферэнцый УЕФА: VOKA пакажа трансляцыю матчаў мінскага «Дынама» і сараеўскага «Жалезнічар».
- НЦМ арганізуе калектыўную экспазіцыю Беларусі на міжнароднай выстаўцы ў Дубаі.

ISSN 1990 — 763X

ПаБАЗАРым

КОЛЕР НАСТРОЮ — ВАЛОШКАВЫ

Учора ў Віцебску XXXII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» адкрыўся ў поўнай меры. Спачатку адгучалі ўрачыстыя акорды адкрыцця апоўначы, у першыя хвіліны дня, на пляцоўцы каля Летняга амфітэатра — над горадам зноў узняўся сцяг форуму мастацтваў, які ніколі за ўсю сваю гісторыю не спыняў дзейнасць. А позна ўвечары адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця (аб гэтым мы напішам падрабязна ў наступным нумары).

Перад тым як над паўночнай сталіцай узняўся сімвал фестывалю, арганізатары запрасілі гасцей і жыхароў горада на Дзвіне на інтэрактыўную дыскатэку ў фармаце open-air. Дапоўнілі агульны настрой лазернае шоу і творчыя калектывы Віцебшчыны. Яшчэ адной разынкай цырымоніі ўзняцця сцяга стаў феерверк, які ў начной цішы літаральна разрэзаў неба над горадам на сотні бліскучых промняў — такога ў гісторыі фестывалю яшчэ не было.

ДЗЕ Б'ЕЦЦА МЕДЫЯСЭРЦА

Учора афіцыйна адкрыўся і міжнародны прэс-цэнтр форуму мастацтваў, адкуль вядуцца прамыя трансляцыі зорных сустрэч і ў рэжыме нон-стоп шчыруюць звыш 400 журналістаў з 8 краін свету. Упершыню сёлета на галоўны творчы форум акрэдытавалі прадстаўнікоў блогасферы — а гэта значыць, што «славянка» крочыць у нагу з сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі, расце і развіваецца разам з маладой аўдыторыяй.

Дырэктар Міжнароднага фестывалю мастацтваў Глеб ЛАПІЦКІ падкрэсліў, што на працягу трох дзесяцігоддзяў свята няўхільна прытрымліваецца свайго дэвіза «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення», аб'ядноўвае прадстаўнікоў розных краін і нацыянальнасцяў. Дыялог культур — гэта тое, для чаго штогод людзі з усяго свету прыязджаюць у горад на Дзвіне. «На форуме аднолькава шануюць артыстаў і прадстаўнікоў культурнай сферы з розных краін. На флагштоках «Славянскага базару» лунаюць сцягі 35 дзяржаў. Фестываль працягвае не проста жыць, а пашырацца, папаўняцца новымі падзеямі і лакацыямі і прыгажэць. СТАР. 4

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Прыродны фактар

«ЦЯПЕР МАЯ ЧАРГА ГЭТЫМ ЗАЙМАЦЦА»

Як крынічная вада праходзіла выпрабаванне на ахоўны статус

Гідралагічныя помнікі прыроды ўпершыню з'явяцца ў Гродзенскім раёне. І хаця ў Беларусі дзясяткі крыніц, якія знаходзяцца пад аховай дзяржавы, атрымаць такі статус няпроста. Напрыклад, актывістам гродзенскага творчага калектыву «Крыніца» спатрэбіўся на гэта не адзін год. СТАР. 3

Беражыце сябе!

Пайшла ў грыбы і не вярнулася...

Што трэба ведаць пра бяспеку падчас ціхага палявання

Грыбны сезон стартаваў. І калі адны аматары ціхага палявання запомняць яго па багатым ураджаі лясных дароў, то іншыя — па доўгіх гадзінах чакання, пакуль ратавальнікі знойдуць іх недзе ў гушчары, а то і ў балоце. СТАР. 2

Беларусь далучылася да 22 міжнародных дагавораў у рамках ШАС

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў закон аб далучэнні Беларусі да міжнародных дагавораў у рамках Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Дакумент размешчаны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, паведаміла БелТА.

У адпаведнасці з законам Беларусь у рамках працэсу атрымання статусу дзяржавы — члена ШАС далучаецца да 22 міжнародных дагавораў. У іх ліку — Хартыя ШАС, Шанхайская канвенцыя аб барацьбе з тэрарызмам, сепаратызмам і экстрэмізмам, пагадненне аб Рэгіянальнай антытэрарыстычнай структуры, Канвенцыя аб прывілеях і імунітэтах ШАС, пагадненні аб супрацоўніцтве ў барацьбе з незаконным абаротам наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў, аб супрацоўніцтве ў галіне выяўлення і перакрыцця каналаў пранікнення асоб, якія маюць дачыненне да тэрарыстычнай, сепаратысцкай і экстрэмісцкай дзейнасці. У пакет дакументаў увайшлі таксама пагадненні аб парадку арганізацыі і правядзення сумесных антытэрарыстычных мерапрыемстваў і вучэнняў, аб правядзенні сумесных ваенных вучэнняў, аб супрацоўніцтве ў галіне забеспячэння міжнароднай інфармацыйнай бяспекі, аб узаемадзеянні пры аказанні дапамогі ў ліквідацыі надзвычайных сітуацый, а таксама канвенцыі ШАС супраць тэрарызму, па процідзеянні экстрэмізму, дагавор аб доўгатэрміновым добрасуседстве, дружбе і супрацоўніцтве дзяржаў — членаў ШАС.

Будзь у курсе!

СПЕЦЫЯЛІСТЫ Ў «ЗЯЛЁНАЙ ЭКАНОМІЦЫ»

У БДУ адкрыюць чатыры новыя профілі міждысцыплінарнай магістратуры

Трэба патлумачыць, што міждысцыплінарныя магістарскія праграмы даюць магчымасць атрымаць веды ў сумежных галінах навуковай і практычнай дзейнасці. Дзякуючы шматпрофільнасці вучэбнай праграмы павышаецца канкурэнтаздольнасць выпускнікоў на нацыянальным і міжнародным рынку працы. Таму цікавасць да міждысцыплінарнага навучання з боку замежных грамадзян расце.

Заняткі праводзяцца ў вочнай форме на двух факультэтах. Уведзена таксама практыка сумеснага кіраўніцтва магістарскімі дысертацыямі. Так, у кожнага магістранта ёсць два навуковыя кіраўнікі, што садзейнічае больш дэталёвай прапрацоўцы міждысцыплінарнага навуковага даследавання.

У БДУ назапашаны ўжо вялікі вопыт па рэалізацыі міжфакультэцкіх магістарскіх праграм. Эканамічны факультэт стаў адным з першых, які працуе ў гэтым напрамку. Сумесна з факультэтам журналістыкі праведзена падрыхтоўка замежнікаў па праграме «Кіраванне медыяпраектамі». З 2021 года ў партнёрстве з факультэтам філасофіі і сацыяльных навук рэалізавана праграма «HR-аналітыка», а з Міжнародным дзяржаўным экалагічным інстытутам імя А. Д. Сахарава — «Прыкладная эканоміка, менеджмент і экалогія».

А сёлета ў БДУ адкрыюць чатыры абсалютна новыя профілі і міждысцыплінарнай магістратуры.

Так, факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі і эканамічны факультэт універсітэта распрацавалі праграму «Зялёная эканоміка і ўстойлівае развіццё арганізацыі» для спецыяльнасці «Эканоміка». Яе выпускнікі змогуць аналізаваць практычныя аспекты экалагічных рызык, выкарыстоўваць «зялёны» маркетынг у арганізацыі дзейнасці прадпрыемстваў, выяўляць прычыны і ацэньваць змены ў навакольным асяроддзі, праводзіць аналіз фактараў і рызык устойлівасці экасістэм пры бягучым узроўні эканамічнага развіцця і ў перспектыве ацэньваць эфектыўнасць дасягнення вугляроднай нейтральнасці эканомікі на глабальным, рэгіянальным і лакальным узроўнях, выконваць матэматычную апрацоўку, статыстычны і прасторавы аналіз даных аб навакольным асяроддзі, абагульняць і сістэматызаваць вынікі даследаванняў.

Таксама стартуе набор у сумесную магістратуру факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі і журналістыкі «Журналістыка ў міжкультурнай і геапалітычнай камунікацыі» на спецыяльнасці «Журналістыка». Яе адкрыццё выклікана патрэбай у журналістах, якія маюць кампетэнтныя веды ў галіне геапалітыкі, эканомікі, краіназнаўства і г. д. Комплекснае вывучэнне прапанаваных дысцыплін дасць магчымасць выпускнікам ствараць якасныя медыяпрадукты і весці прафесійную дзейнасць ва ўмовах полікультурнасці рэгіёнаў і свету з улікам іх прыродна-рэсурснага патэнцыялу, геапалітычных і сацыяльна-эканамічных працэсаў. Выпускнікі змогуць аналізаваць геапалітычную сітуацыю на сусветным і рэгіянальных узроўнях для ўстанаўлення рэгіянальных сувязяў паміж геастратэгічнымі аспектамі сусветнага развіцця.

Яшчэ адна новая сумесная праграма «Фінансы ў лічбавай эканоміцы» на спецыяльнасці «Эканоміка» ствараласа намаганнямі эканамічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў. Яна накіравана на падрыхтоўку аналітыкаў, якія валодаюць прафесійнымі кампетэнцыямі ў галіне лічбавізацыі фінансавага, інвестыцыйнага і антыкрызіснага кіравання для стварэння і прадастаўлення фінансавых і банкаўскіх прадуктаў і паслуг. Адметнасцю праграмы з'яўляецца акцэнт на прыкладное прымяненне спецыялістамі атрыманых ведаў ва ўмовах фарміравання лічбавай эканомікі.

А эканамічны і юрыдычны факультэты прапануюць новую магістарскую праграму «Прыкладная эканоміка, менеджмент і права» на спецыяльнасці «Менеджмент», дзе будуць рыхтаваць аналітыкаў у галіне бізнес-працэсаў і эканамічнай палітыкі. Адукацыйны курс арыентаваны на вывучэнне праблем кіраўніцкай эканомікі, эканамічнага аналізу, ацэнкі рызык і канкурэнтаздольнасці кампаній і галін. Таксама асаблівая ўвага будзе ўдзяляцца прававым асновам і заканадаўчай базе.

Прадугледжваецца, што вопыт згаданых факультэтаў будзе выкарыстаны для рэалізацыі міждысцыплінарнай падрыхтоўкі студэнтаў і на іншых спецыяльнасцях магістратуры БДУ.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Прыярытэты

МІЖРЭГІЯНАЛЬНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА — ПАДМУРАК ПРАКТЫЧНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ З КІТАЕМ

Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва — падмурак беларуска-кітайскага практычнага ўзаемадзеяння ва ўсіх сферах. Аб гэтым заявіў першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай Снапкоў падчас візіту ў правінцыю Шэньсі, паведамілі БелТА ў прэс-службе ўрада.

На перагаворах з сакратаром партыйнага камітэта КПК правінцыі Шэньсі Чжаа Ідэ Мікалай Снапкоў адзначыў, што гэта правінцыя з'яўляецца надзейным сябрам як Магілёўскай вобласці (з улікам устаноўленага пабрацімства), так і Беларусі ў цэлым.

«Бакі адзначылі вялікі патэнцыял у сумесным развіцці і інвеставанні. Дамовіліся нарошчваць узаемны тавараабарот, развіваць чыгуначныя перавозкі ў напрамку Беларусь — Кітай — Беларусь, узаемадапаўняльную прамысловую кааперацыю, прыцягваць кітайскія прадпрыемствы да рэалізацыі новых інвестыцыйных праектаў для стварэння паўнацэннага субпарка правінцыі Шэньсі ў індустрыяльным парку «Вялікі камень», — адзначылі ў прэс-службе.

Мікалай Снапкоў таксама правёў перагаворы з лідзіруючымі вытворцамі аўтакампанентаў на рынку Кітая. З улікам актуальных рыначных патрэб і вызваленых рыначных ніш, а таксама існуючых у Беларусі развітых кампетэнцый і высокакваліфікаваных кадраў бакі пацвердзілі намер развіваць дзеючыя сумесныя прадпрыемствы, павялічваючы іх магутнасці па выпуску прадукцыі, а таксама ствараць новыя вытворчасці.

У час дзяржаўнага візіту Прэзідэнта Беларусі ў Кітай 1 сакавіка бягучага года лідары дзвюх краін вызначылі прыярытэтнасць развіцця міжрэгіянальных сувязяў, неабходнасць паглыблення гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння з буйнымі гарадамі і правінцыямі Кітая і напаўненне практычным зместам. Было прынята рашэнне аб прадаўжэнні на 2023-і Года рэгіёнаў дзвюх краін.

Пайшла ў грыбы і не вярнулася...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Штогод у беларускіх лясах губляюцца сотні чалавек. 79-гадовая жанчына не стала выключэннем. Пенсіянерка цудам выжыла дзякуючы таму, што набрыла на кукурузнае поле. Жыхарка Глускага раёна 13 кастрычніка мінулага года пайшла ў лес у грыбы і не вярнулася, паведамляла прэс-служба Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі. Пенсіянерка згубілася каля вёскі Поблін, блукала тры дні і чатыры ночы. Мабільнага тэлефона з сабой не было, яе шукалі ратавальнікі, работнікі міліцыі, лясгаса, валанцёры і мясцовыя жыхары. Яна цудам засталася жывая: набрыла на кукурузнае поле паміж вёскамі Поблін і Розлевічы і сілкавалася зернямі. Калі пенсіянерку знайшлі, яна была ў свядомасці, але без сіл. У першую чаргу жанчына папрасіла вады — яна адчувала моцную смагу. Пацярпелую перадалі медыкам.

— Штогод мы рэагуем на 100—400 выпадкаў. Шмат залежыць ад надвор'я і ўраджайнасці. Самым пікавым быў 2017 год. Сёлета чэрвень выдаўся засушлівым, у органы ўнутраных спраў паступалі адзінкавыя звароты. Састарэлыя грамадзяне хадзілі па сваіх грыбных і ягадных месцах на разведку. Усіх, хто прападаў у траўні-чэрвені, удалося ўстанавіць. А ўжо першыя выхадныя ліпеня падарылі нам цэлы букет трывожных сігналаў з усіх рэгіёнаў краіны, — расказаў **начальнік аддзела арганізацыі вышукавай работы галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі МУС Дзмітрый КРУКАЎ.**

Так, напрыклад, 30 чэрвеня жыхарка Гомеля 1955 года нараджэння з'язджае ў 5.30 на мяжу раёна збіраць грыбы, мае пры сабе недастаткова зараджаны мабільны тэлефон. А 9-й раніцы тэлефануе дачцэ і кажа, што падвярнула нагу, не можа ісці, заблукала. У 16.00 дачка паведаміла ў міліцыю. Былі прыцягнутыя сур'ёзныя сілы, сродкі, грамадскасць. Сумесныміі намаганнямі толькі ўвечары 4 ліпеня змаглі ўстанавіць месца знаходжання і эвакуіраваць пенсіянерку з лясного масіву.

Падобная сітуацыя была ў Смаргонскім раёне. 28 чэрвеня жанчына 1957 года нараджэння пайшла ў лес. Сваякі доўга чакалі, што яна вернецца, і толькі 1 ліпеня паведамілі ў міліцыю. Былі арганізаваны пошукавыя мерапрыемствы. 3 ліпеня жанчыну ўдалося знайсці.

У Столінскім раёне пенсіянерка 1947 года нараджэння без мабільнага тэлефона адправілася па грыбы. На ёй было адзенне цёмна-шэрага колеру, з сабой цёмна-зялёнае вядро. На жаль, жанчыну дагэтуль не знайшлі...

Жыхарка Мінска 1946 года нараджэння 11 ліпеня паехала на балота ў Чэрвеньскі раён збіраць ягады, перастала выходзіць на сувязь, тэлефон быў дрэнна зараджаны і адключыўся. Учора ўдалося знайсці яе цела дзякуючы яркаму адзенню і чырвонаму вядру.

— Важна па магчымасці праводзіць прафілактычныя гутаркі са сваякамі, на прыкладах паказваць і тлумачыць, што лепш усё ж такі лішні раз перастраховацца, знайсці час, каб пайсці ў лес разам. За апошнія 10 гадоў мы не знайшлі больш за 80 чалавек, выратавалі звыш 2000. Для нас важна кожнае жыццё, кожны лёс. Не трэба думаць, што паход у лес — як у гарадскі парк, — падагульніў Дзмітрый Крукаў.

— Агульная плошча лясоў у краіне складае больш за 9,5 мільёна гектараў. Як правіла, у зоне рызыкі аказваюцца пенсіянеры і дзеці. У большасці выпадкаў мы шукаем на вялікіх плошчах ва ўмовах густога непрадыднага лесу і на балоцістай мясцовасці. Час пошукаў складае ад некалькіх гадзін да некалькіх дзён і нават тыдняў. Прыцягваем значныя сілы МНС, МУС і іншыя арганізацыі, — расказаў **начальнік цэнтра пошукава-ратавальных работ і пажаратушэння рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння «ЗУБР» МНС Аляксандр ШЧАЎРОЎСКІ.** — У 2020 годзе было знойдзена 730 чалавек, з іх — 33 дзіцяці, у 2021-м — 576 чалавек, з іх 56 дзяцей, у 2023-м — ужо 24 чалавекі, з іх 9 дзяцей.

Ратавальнікі нагадваюць: дзеці — асаблівая адказнасць бацькоў. Калі адпраўляеце дзіця ў вёску, раскажыце яму пра бяспеку! Калі гаворка ідзе пра зусім маленькіх, то рэкамендацыя адна — не пакідаць без нагляду ні пад якой падставай.

Перад выхадам у лес вывучыце карту мясцовасці, узбройцеся тэлефонам і мінімальнай аптэчкай. Каб не згубіцца, калі вы ідзяце кампаніяй, можна скарыстацца свістком. Яго гук чутны за 2-3 кіламетры.

Збіраючыся ў лес, звярнайце ўвагу на ўмовы надвор'я: у пахмурнае надвор'е паход лепш адкласці. Калі паход у грыбы або ягады — справа вырашаная, выконвайце наступныя рэкамендацыі: не адпраўляйцеся ў лес у адзіночку, вывучыце асноўныя правілы арыентавання, паведаміце сваякам або знаёмым аб запланаваным маршруце і часе вяртання, своечасова інфармуйце іх, калі планы зменяліся, апранайце зручнае, непрамакальнае адзенне і абутак, вазьміце з сабой таксама ваду, нож, запалкі.

Калі вы заблукалі ў лесе, першае, што неабходна, — сарыентавацца на мясцовасці, вызначыць, дзе можна знайсці ваду і развесці агонь, каб абараніцца ад холаду і арганізаваць начлег. Калі ў вас з сабой мабільны тэлефон, набярыце нумар службы ратавання «101» і паведаміце, з якога населенага пункта і з якога раёна ўвайшлі ў лес, апішыце, што бачыце вакол сябе.

Калі апынуліся ў лесе без тэлефона, а сваё месцазнаходжанне не можаце вызначыць нават прыблізна, спыніцеся і супакойцеся. Галоўнае для вас — выйсці да людзей, таму важнымі арыенцірамі будуць лініі электрапередачы, прасекі і сцяжынкі. Выявіўшы любы з гэтых аб'ектаў, ідзіце ўздоўж яго, і вы абавязкова знойдзеце людзей.

Калі на шляху сустрэнецца ручай або рака, прытрымлівайцеся шляху ўніз па цячэнні. Прыслухайцеся: шум трактара чуваць за тры кіламетры, брэх сабакі — за 2-3 кіламетры, цягнік — за 10 кіламетраў — ідзіце на гук!

Не варта выбірацца з лесу ноччу: пачынае цямнець — лепш займіцеся ўладкаваннем месца для начлегу. Дарэчы, аб барацьбе з холадам: ліст газеты, засунуты пад вопратку, памяншае цепладдачу ўдвая. Такі ж эфект дае і лістота, набітая пад вопратку. Арганізоўваючы начлег, паклапаціцеся, каб ратавальнікі не прайшлі міма — павесьце на кусты кепку, яркую хустку або ліст паперы, абламайце галінкі, каб прыцягнуць увагу.

Існуе дадатак МНС «Дапамога побач». У ім ёсць рэкамендацыі па дзеяннях пры розных надзвычайных сітуацыях.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

«ЦЯПЕР МАЯ ЧАРГА ГЭТЫМ ЗАЙМАЦЦА»

Эксперымент атрымаўся

Ініцыятарам гэтай справы па праве можна назваць **кіраўніка грамадскага аб'яднання «Крыніца» Тэрэзу БЕЛАВУСАВУ.** Яе апантанасць вядома не толькі адпаведным службам, але і многім мясцовым чыноўнікам. За некалькі дзясяткаў гадоў сабраны даволі значны стос дакументаў і навуковых даследаванняў. А пачыналі гэту справу з вопыту... над пацукамі. Даследаванні вяліся ў інстытуце фізіялогіі НАН Беларусі. Крынічнай вадой паілі эксперыментальных жывёл для вывучэння змяненняў паказчыкаў асноўнага абмену ў арганізме. У даследаванні былі задзейнічаны 16 пацукоў, сярэдняй вагой 220—250 грамаў. Жывёл паілі штодзённа на працягу 30 дзён з разліку 1,5 мл на 100 грамаў масы. Як сведчыць дакумент, быў атрыманы добры вынік. Аналіз паказаў, што вада можа прымяняцца ў мэтах не толькі пітных, але аздараўленчых і нават лекавых — аналагаў яе ў краіне няма. Вопыт праводзілі гадоў 20 таму. І хоць вынік быў станоўчы, трапіць у статус ахоўных крыніц аказалася справай зусім не хуткай. Але Тэрэза Іосіфаўна ад сваёй мэты не адступіла і крок за крокам прасоўвала гэту ідэю на ўсіх узроўнях.

— У мінулым годзе я выступіла з прэзентацыяй нашых гродзенскіх крыніц на міжнародным экалагічным форуме ў Мінску. Важную частку майго даклада займалі вынікі навуковых даследаванняў, у прыватнасці хімічнага складу крынічнай вады. Усе маглі яе папіць. Яна слабамінералізаваная, бо ў тых мясцінах прабураны свідравіны і знойдзены запасы мінеральнай вады, але праграма па яе здабычы была спынена, а свідравіны закансераваны. Не хачу, каб такі лёс напаткаў і крыніцы. Таму сёння мы робім усё, каб захаваць гэтыя прыродныя аб'екты.

На яе думку, менавіта пасля гэтага форуму справа па прызнанні крыніц помнікамі прыроды стала ісці хутчэй.

Аб чым расказалі паданні

Такіх адметных крыніц у нашай гераіні некалькі, і яны вядомы ёй з дзяцінства. У яе сям'і нямала паданняў аб тым, якія хваробы лечыць кожная з крыніц. І гэтыя веды яна імкнецца распаўсюдзіць. Але галоўная мэта — каб вадой магло карыстацца як мага больш людзей. Таму ў першую чаргу крыніцы былі вызначаны на мясцовасці. Назвы знайшліся самі сабой. Адна стала

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

называцца імем бабулі Марыяны. Тая, куды па легендзе прыязджала з Гродна Эліза Ажэшка, атрымала назву ў гонар пісьменніцы. Сто крыніц — з-за вялікай колькасці падземных вод, а Райгарад — з-за мясцовага падання. Маўляў, шмат стагоддзяў таму тут, дзе цяпер цячэ крыніца, быў горад, які праваліўся пад зямлю. А на яго месцы ўтварылася западзіна плошчай 30 гектараў. Дарэчы, Нёманская западзіна на беларуска-літоўскім памежжы з'яўляецца помнікам прыроды рэспубліканскага значэння.

Гродзенскі краязнаўца Аляксандр Госцеў пазбягае містыкі і лічыць: горад знік з-за таго, што Нёман у тыя часы па нейкіх прычынах змяніў сваё рэчышча. А крыніц шмат таму, што пад ракой праходзіць мелавы і крэмніевы шлейф, які ствараўся мільёны гадоў і ачышчае падземную ваду. Ад таго і крыніцы тут маюць гаючую сілу. Краязнаўца прыгадаў, што падчас яго работы ў гродзенскім ліцэі школьнікі займаліся вывучэннем стану гарадскіх крыніц у рамках праекта клубаў ЮНЕСКА. Было даследавана і апрацавана каля 30 крыніц у межах горада. Многія так і засталіся ў тым стане, які быў дзясяткі гадоў таму, а некаторыя зніклі. Былы педагог лічыць, што да справы захавання крыніц трэба прыцягваць школьнікаў і студэнтаў. Пры гэтым займацца не толькі даследаваннем вады, але і добраўпарадкаваннем прыродных гідралагічных аб'ектаў.

І вады папіць, і адпачыць...

Гродзенская актывістка не спыняецца на тэарэтычных даследаваннях. На крыніцах вядзецца значная практычная работа як грамадскай арганізацыяй, так і ўласнікамі гэтых крыніц — сельскім Саветам і лясгасам. Сістэматычна праводзіцца санітарная ачыстка прылеглай тэрыторыі ад хмызняку і смецця.

Перамога ў конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў у мінулым годзе дазволіла значна прасунуць справу па добраўпарадкаванні крыніц. З дапамогай гродзенскіх скульптараў і работнікаў лясгаса былі ўсталяваны стылізаваныя драўляныя ўказальнікі, зроблены дубовыя лаўкі, навес, сталы і нават скульптура дзяўчыны, якая сядзіць з кубачкам у руках каля крыніцы Элізы Ажэшкі. Устаноўлены сметніцы, дарожкі пасыпаны жвірам.

— У гэтым праекце дапамагалі гродзенскія скульптары. Так з'явілася скульптура ў вобразе Ажэшкі. І гэта не міф. Пісьменніца сапраўды прыязджала ў Гожскі храм і заварочвала да крыніцы. Кажуць, што гэта вада спрыяе захоўванню прыгажосці і маладосці, — заўважае Тэрэза Белавусава.

Дзякуючы агульным намаганням удалося значна акультурыць крыніцы. Перавага зроблена ў бок натуральных драўляных матэрыялаў. Праўда, грант быў выдзелены невялікі — усяго 7 тысяч рублёў, але дапамаглі спонсары, якія аплацілі скульптурную кампазіцыю. Між іншым, спыняцца на тым, што ёсць, актывістка не збіраецца. Яе намаганні падтрымалі ў інстытуце «Гроднаграмадзянпраект» і прапанавалі цікавы праект па добраўпарадкаванні крыніцы Райгарад. Калі не ўдавацца ў дэталі, на першы план выходзіць скульптура вялізнай райскай птушкі, якая нібы ахоўвае крыніцу. Таксама ёсць прапанова паставіць тут лаўкі, навес і абавязкова ўладкаваць стаянку для веласіпедаў. Дарожкі таксама плануюць аднавіць. Магчыма, скульптурныя кампазіцыі з'явяцца ў выніку пленэру рэзчыкаў па дрэве. І хаця такое мерапрыемства патрабуе значных сродкаў, Белавусава не падае духам. Яна верыць, што абавязкова знойдзе магчымасць давесці справу да канца.

— За гэтымі крыніцамі сачылі мае продкі: падкошвалі траву, прывозілі для абкладвання дарожак камяні, чысцілі наваколле — цяпер мая чарга гэтым займацца. Вядома, на грамадскіх пачатках. Хоць і паціху, але справа ідзе. Мне сын прысылаў грошы на пуцёўку ў санаторый, але здавалася, што крыніцы важнейшыя, — упэўнена жанчына.

Сваю апантанасць яна накіроўвае на тое, каб захаваць крыніцы для нашчадкаў. У гэтым сэнсе яны патрабуюць новага падыходу ў фарміраванні экалагічнай палітыкі, навукова-даследчага і прававога суправаджэння. І тут павінны вырашацца дзве задачы — выкарыстанне і ахова. Вось чаму так важна наданне статусу помнікаў прыроды. Калі будзе помнік — будуць і бюджэтныя сродкі, лічыць актывістка.

Як атрымаць ахоўную грамату?

Як паведамілі ў Гродзенскім абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, усе неабходныя дакументы па наданні крыніцам статусу помнікаў прыроды мясцовага значэння падрыхтаваны і накіраваны ў райвыканкам. Такім чынам, у Гродзенскім раёне пад ахову дзяржавы ўпершыню будуць узяты шэсць гідралагічных аб'ектаў.

Навошта гэта патрэбна? Па словах **загадчыка сектара НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах Уладзіміра БАЙЧАРАВА,** ахоўны статус дазволіць захаваць помнікі прыроды на будучыню. Аб'ект мае прававую абарону, свайго роду ахоўную грамату, дзе прапісана, што там рабіць можна, а што — нельга.

— У Беларусі каля сотні крыніц маюць такі статус. І гэта работа ідзе няспынна. Нядаўна ў Гродзенскай вобласці мы разглядалі яшчэ аднаго кандыдата на ахоўны статус, што знаходзіцца ў Астравецкім раёне, дзе рака Вілія падыходзіць да літоўскай мяжы. Мы ў свой час афармілі там каля дзясятка крыніц рэспубліканскага значэння. На працэдуру спатрэбілася тры гады і зацвярджэнне ў Савеце Міністраў. Помнікі мясцовага значэння, як крыніцы ў Гродзенскім раёне, зацвярджаюць выканкамы, — паведаміў навуковец.

Па яго словах, сёлета завяршаецца шасцігадовы праект па даследаванні найбольш значных крыніц у розных рэгіёнах Беларусі. У кожнай вобласці вылучана па пяць крыніц, якія варта аб'явіць помнікамі прыроды, інакш яны могуць проста знікнуць. Каб гэтага не адбылося, неабходна абсталяваць водазабор, добраўпарадкаваць тэрыторыю, усталяваць шыльды з інфармацыяй. Гэту функцыю і павінны ўзяць на сябе мясцовыя органы ўлады.

— Мы ім даём пакет усіх неабходных дакументаў. Там ёсць і гідралогія, і гідрахімія, і гідрабіялогія, усё даследавана, усё лабараторна праверана, зроблены неабходныя аналізы, таму ў гэтым напрамку ніякіх выдаткаў не патрабуецца, — зазначыў Уладзімір Байчараў. — Адзінае, што можна зрабіць, — добраўпарадкаваць крыніцы. І тут можна прыцягнуць спонсарскія сродкі альбо іншыя крыніцы фінансавання.

Магчыма, справа па добраўпарадкаванні крыніц рухалася б хутчэй, калі б гэты статус зацвярджалі не райвыканкамы, а прыродаахоўныя органы, лічыць навуковец. Пакуль гэта справа не ўсюды мае пэўную падтрымку. А між тым вада з крыніцы — вельмі каштоўны прадукт. Як расказала **доктар медыцынскіх навук, прафесар кафедры рэабілітацыі Гродзенскага медуніверсітэта Ларыса ПІРАГОВА,** сёння ў аздараўленні вельмі важнае значэнне надаецца прыродным фактарам. У крынічнай вадзе ўтвараюцца натуральныя аэраіоны, якія станоўча ўплываюць на арганізм чалавека. Бутыляваная вада губляе свае якасці, бо праходзіць працэс абеззаражвання і абпраменьвання ўльтрафіялетам і не настолькі карысная, як вада з крыніцы.

— Нашы санаторыі таксама скіраваны на аздараўленне прыроднымі фактарамі. Гэта аэраіонатэрапія, мінералатэрапія, бруштынавыя і саляныя пакоі... Укараняецца шмат методык, у тым ліку з уздзеяннем крыніц, — акцэнтуе ўвагу Ларыса Пірагова.

Наколькі захаваецца гэты прыродны дар, залежыць у першую чаргу ад мясцовых органаў улады. Намаганняў грамадскасці тут недастаткова. Нават апантаным гэтай справай спатрэбілася не адно дзесяцігоддзе, каб даволі знакамітыя крыніцы былі ўзяты пад ахову дзяржавы. Цяпер работа па гродзенскіх гідралагічных аб'ектах будзе весціся ў адпаведнасці з распрацаванымі праектамі з улікам экалагічных нормаў, упэўнена Тэрэза Белавусава. Яна ўжо плануе стварыць інклюзіўную прастору для інвалідаў-калясачнікаў, марыць аб адкрыцці музея крынічнай вады і рыхтуе маршрут аздараўленчага турызму. «Гэта справа майго жыцця, а крыніцы даюць мне сілу», — кажа жанчына.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Швецыі падчас акцыі пратэсту спалілі статут НАТА

Акцыя пратэсту, падчас якой быў спалены статут НАТА, прайшла на поўдні Швецыі ў горадзе Хельсінгбаргу. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на выданне Helsingborgs Dagblad. За ходам акцыі назірала шмат паліцыянтаў, якія не ўмешваліся ў працэс з-за адсутнасці правапарушэнняў. Арганізатар акцыі 29-гадовы Лукас Юнгквіст першапачаткова падаваў прашэнне на правядзенне дэманстрацыі, падчас якой планавалася спаленне святых пісанняў. Пазней ён папрасіў прабачэння ва ўсіх, каго закранула або абразіла яго ідэя, і заявіў, што замест Карана ён спаліць статут НАТА. На галаве ў Юнгквіста была надзета кепка з назвай правай радыкальнай партыі «Жорсткі курс». Яе лідар Расмус Палудан, які з'яўляецца дацка-шведскім падданым, неаднойчы праводзіў у Швецыі акцыі, падчас якіх спальваў Каран. Яго паводзіны сталіся прычынай масавых беспарадкаў.

У Францыі забаранілі продаж і транспарціроўку феерверкаў

У краіне забаранілі прыватным асобам продаж і транспарціроўку феерверкаў. Раней прэм'ер-міністр Францыі Элізабэт Борн паабяцала маштабныя меры бяспекі ў сувязі са святкаваннем Дня ўзяцця Бастыліі, у тым ліку забарону на продаж феерверкаў, пасля нядаўняй хвалі гвалту ў краіне з-за забойства падлетка паліцыяй у горадзе Нантэр. «У мэтах прадухілення рызыкі сур'ёзных парушэнняў грамадскага парадку падчас святкавання 14 ліпеня ўказам прадугледжана забарона на продаж і транспарціроўку піратэхнікі і феерверкаў да 15 ліпеня ўключна», — адзначаецца ў дакументе. Дзень узяцця Бастыліі, галоўнае нацыянальнае свята Францыі, адзначаецца 14 ліпеня і традыцыйна суправаджаецца маштабнымі мерапрыемствамі па ўсёй краіне.

Хваля анамальнай спякоты ахапіла паўднёвую Еўропу

Агенцтва Associated Press паведамляе, што, паводле звестак іспанскай метэаралагічнай службы, у найбліжэйшыя дні ў паўднёва-ўсходніх раёнах Пірэнейскага паўвострава тэмпература можа падняцца да 45 градусаў па Цэльсію. Пры гэтым тэмпература ўжо перавысіла або перавысіць у найбліжэйшыя дні адзнаку 40 градусаў па Цэльсію ў Францыі, Грэцыі, Харватыі і Турцыі. Як адзначае «Бі-бі-сі», цяжэй за ўсё сітуацыя ў Італіі, дзе спякота можа дасягнуць 48,8 градуса — пагоднага рэкорду для Еўропы, зафіксаванага ў краіне ў 2021 годзе. Прычынай высокіх тэмператур з'яўляецца цеплавая хваля «Цэрбер», якой далі такую назву ў Італьянскім метэаралагічным таварыстве. CNN адзначае, што ў пятніцу «Цэрбэр» можа замяніць новы атмасферны фронт «Харон», з-за чаго на наступным тыдні тэмпературы ў Італіі могуць падняцца яшчэ вышэй.

КОЛЕР НАСТРОЮ — ВАЛОШКАВЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У гэтым годзе ён прымае больш за пяць тысяч артыстаў. Упершыню ўдзельнічаюць у конкурсах дарослых і юных выканаўцаў прадстаўнікі Кіпра і Аўстраліі. Ужо прададзена больш за 60 тысяч білетаў на асноўныя мерапрыемствы, на некаторыя яны яшчэ засталіся», — падкрэсліў Глеб Лапіцкі.

«Фестываль дорыць мноства эмоцый, цеплыню сяброўскіх сустрэч, пачуццё роднага дома — усё тое, што дае кожнаму чалавеку радасць. Таму на працягу ўжо многіх гадоў гэты форум захоўвае любоў публікі, верных прыхільнікаў, уцягваючы ў сваю непаўторную атмасферу новых сяброў», — адзначыў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.**

Вядома, ахапіць усе новыя пляцоўкі, паглядзець на свежыя элементы інфраструктуры горада за адзін дзень не атрымаецца. Але калі затрымацца ў культурнай сталіцы хаця б на некалькі дзён, то можна адчуць на сабе сапраўдны фестывальны дух. Так, на прэс-канферэнцыі, прысвечанай адкрыццю міжнароднага прэс-цэнтра, **мэр горада Мікалай АРЛОЎ** параіў гасцям форуму абавязкова пракаціцца на экскурсійным віцебскім трамваі, які сёлета адзначыў 125-годдзе. «Я рады вітаць вас у гасцінным Віцебску і не сумняваюся, што на працягу ўсіх фестывальных дзён на ўсіх яго канцэртных пляцоўках — у Горадзе майстроў, на вуліцах, плошчах, у скверах і парках — вам будзе ўтульна, камфортна, з'явяцца новыя добрыя ўспаміны і сустрэчы. Таму жадаю ўсім яскравых уражанняў ад фестывальных мерапрыемстваў і ад таго, што «Славянскі базар» зноў сустракае сваіх сяброў», — запрасіў Мікалай Арлоў.

НОВАЯ ЗОРКА НА АЛЕІ

Учора раскрылася адна з галоўных інтрыг фестывалю — чыя валошка на Алеі зорак «Славянскага базару» з'явіцца сёлета. 13 ліпеня запалілася імянная зорка заслужанай артысткі Беларусі Алены Спірыдовіч. Алена Барысаўна — сапраўдны сімвал форуму мастацтваў, бо з 1993 года з'яўляецца нязменнай яго вядучай. Пліта з валошкай стала 19-й па ліку, якая з'явілася каля галоўнай канцэртнай пляцоўкі горада, а гэта значыць, што яе ўладальніца стала сёлета лаўрэатам спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Беларусі «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення».

«Вельмі прыгожая, таленавітая, мудрая жанчына з'яўляецца музай фестывалю. Здаецца, зусім нядаўна яна казала, што фестываль павінен мець сваю радзіму. І вось ужо на працягу больш як трох дзесяцігоддзяў «Славянскі базар» атрымаў прапіску на бласлаўлёнай віцебскай зямлі. Вы легендарны чалавек і, няхай гэта будзе сцэнічная пляцоўка ці тэлеэкран, заўсёды паказваеце сапраўднае майстэрства, найвышэйшы прафесіяналізм, вы з'яўляецеся прыкладам інтэлігентнасці і абаяння, праслаўляеце нашу родную Беларусь, робіце каласальную работу па ўмацаванні сяброўства і ўзаемаразумення паміж славянскімі народамі», — звярнуўся да вядучай **міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ.**

Алена Спірыдовіч падзякавала ўсім, хто прыйшоў падзяліць з ёй радасць. Паводле яе слоў, зараз яна дакладна ведае, што не толькі яе сэрца і найлепшыя ўспаміны застануцца ў Віцебску, але і імянная зорка. Тэлевядучая прызналася фестывалю ў любові і звярнулася да гледачоў: «Я схіляюся перад вамі і працую для вас».

ГОРАД ЖЫВЕ ТВОРЧАСЦЮ

Учора стартаваў IX Фэст вулічнага мастацтва «На сямі вятрах», удзельнікаў якога можна будзе сустрэць у шматлікіх лакацыях гістарычнага цэнтра горада да 16 ліпеня. У гэтым годзе знакамітыя віцебскія «піраміды» — гандлёвы цэнтр «Марка-Сіці» — таксама сталі арэнай для разгортвання перформансаў вулічных артыстаў. Тут ужо працуе выстаўка сучаснага мастацтва «974», на якой 12 віцебскіх мастакоў прадставілі свае работы. У рамках праекта «Тэатр на даху» ладзяцца майстар-класы, шоу ілюзіяністаў, спектаклі. Пушкінскі мост, які на час форуму ператварыўся ў «Мост перфомансаў», традыцыйна з'яўляецца месцам прыцягнення турыстаў, бо менавіта адсюль госці ад'язджаюць з самымі запамінальнымі фотаздымкамі. З кожным годам фэст здзіўляе шматжанравасцю і буйствам персанажаў, а сёлета арганізатары распрацавалі мабільны дадатак «fest7vetrov», каб любы ахвотны змог знайсці для сябе цікавую пляцоўку і не згубіцца ў моры падзей.

У Віцебскай абласной філармоніі ўчора прайшоў канцэрт аркестра Якаўлева Grand Melody Orhestra, а канцэртная зала «Віцебск» не шкадавала шчырых апладысментаў для Уладзіміра Праснякова. Увечары адбылося ўрачыстае адкрыццё XXXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», дзе выступілі Юрый Антонаў, Алена Ваенга, Сяргей Лазараў, група «На-На» і іншыя. Па традыцыі неба над горадам асвяціў святочны салют, ужо другі па ліку за адзін дзень.

Пачаліся паказы спектакляў у рамках праекта «Лялечны квартал» для самых маленькіх жыхароў: учора беларускі тэатр «Лялька» запрашаў на спектаклі «Насарог і жырафа», «Матылёк». А плеяду праекта «Тэатральныя сустрэчы» працягнуў мюзікл-біяграфія «Гур'янаў».

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Кінамайстры

«КАЛІ ДУША ПРОСІЦЬ, ІДЗІ...»

Сёлета кінематаграфічны свет адзначае 100-годдзе (13 ліпеня) з дня нараджэння народнага артыста СССР Міхаіла Пугаўкіна. Згадаюць вялікага акцёра ў эфіры тэлеканалаў «Беларусь 3» і на «Расія-Культура».

Так, з нагоды святочнай даты на сацыякультурным канале з удзелам акцёра тэатра і кіно пакажуць фільм «Вяселле ў Малінаўцы». Музычная камедыя стала экранізацыяй аднайменнай аперэты народнага артыста СССР Барыса Аляксандрава і аб'яднала ў адным праекце такіх акцёраў, як Уладзімір Самойлаў, Людміла Алфімава, Яўген Лебедзеў, Зоя Фёдарава, Андрэй Абрыкосаў і іншых. А Мікалай Пугаўкін адносіў стужку да тых работ, якімі ганарыўся. Увогуле, работу ў рэжысёраў Леаніда Гайдая, Андрэя Тутышкіна, Аляксандра Роу акцёр лічыў найлепшым часам сваёй творчасці ў кіно. Каб згадаць якраз адну з работ гэтага перыяду, заплануйце прагляд «Вяселля ў Малінаўцы» вечарам 15 ці 16 ліпеня.

У эфіры тэлеканала «Расія-Культура» ў нядзелю 16 ліпеня паглядзіце дакументальны фільм з цыкла «Астравы», дзе пра любімага артыста, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны расказваюць Вера Васільева, Сяргей Шакураў, Сяргей Ніканенка, Мікалай Досталь, Ірына Лаўрова, Людміла Сямёнава і іншыя. Усе казалі яму, што з такім тварам у мастацтва не трапіць! А мама Міхаіла Іванавіча параіла сыну: «Калі душа просіць, ідзі, сынок». Здымачная група фільма пабывала на радзіме героя і на месцы баёў 1147 стралковага палка, у якім Міхаіл Пугаўкін служыў разведчыкам... А пасля нас чакае паказ мастацкага фільма «Пад купалам цырка» (Экран, 1989 г.), які быў зняты рэжысёрам Уладзімірам Семаковым. Музычную кінастужку пра выпускнікоў цыркавога вучылішча знялі па матывах аперэты Дунаеўскага «Сын клоўна». У кадры разам з Міхаілам Пугаўкіным кінагісторыю ўвасабляліІрына Феафанава, Аляксандр Кулямін, Соф'я Гаршкова, Аляксандр Барынаў.

Глядзіце фільм у вячэрнім эфіры.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 176

Новую задачу прапануе нам Аляксандр Зелянко з Маладзечна ***(гл. дыяграму)***.



Белыя: Крg4, Фh1, Лe4, Кf5 (4).

Чорныя: Крd5, пп. с6, f6 (3).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г.Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У міжнародным конкурсе да 80-годдзя Курскай бітвы, арганізаваным у Расіі, наступная задача Вячаслава Красічонка і Віктара Волчака атрымала першы пачэсны водгук.

Белыя: Крh7, Фf8, Лb4, Лe8, Са5, Сb7, Кb1, Кe3, пп. d2, g2, g5 (11).

Чорныя: Крd4, Лс5, Лd6, Сb8, Сd7, Кb5, Кf2, пп. а6, с4, d3, f5, f6, f7, g4 (14).

Мат за 4 хады.

1. Фе7! ~ 2. Кс2+ dc 3. Фе3х, 1...Лdс6 2. Л:b5! (3. Сс3х) Кd1! 3. Сс3+ К:с3 4. dcх, 2...Лe5/Се6/Се5 3. Фс5+ Лс:с5 4. Сс3х, 3... Крe4 4. Ф:с4х, 1...Сс6 2. Сb6! (3.Л:с4х) Ка3 3. К:f5+ Крd5 4. Кс3х, 2...Лe6 3. Ф:с5+ Крe4 4. Ф:f5х; 1...Се6 2. Ф:f6+ Лe5 3. Л:с4+ С:с4 4. Ф:e5х, 1...Лe6 2. К:f5+ Л:f5 3. Л:с4+ Кр:с4 4. Фb4х, 3...Крe5 4. Фс5х, 2...Крe5 3. Ф:f6+ Крf4 4. g3х

* * *

У Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі (Мінск) адбыўся турнір па бліцы (108 удзельнікаў). Перамог майстар FIDE Максім Царук, які набраў 7,5 бала з 9 магчымых. 2-3-е месцы падзялілі гросмайстры Сяргей Жыгалка і Аляксей Аляксандраў (па 7 балаў). Сярод жанчын найлепшы вынік у чэмпіёнкі краіны Варвары Паляковай — 6,5 бала, шостае месца.

У Магілёве прайшоў IV Мемарыял Святаслава Казака. У класічных шахматах (72 удзельнікі) прызавую тройку склалі Сяргей Вашчылаў, Аляксей Краміч і Цімур Гвоздзеў, у хуткіх шахматах (52 гульцы) — майстар FIDE Валянцін Уласаў (Расія), Цімур Гвоздзеў і майстар FIDE Уладзіслаў Каташук, у бліцы (70 удзельнікаў) — Валянцін Уласаў, міжнародны майстар Пётр Карзубаў і Цімур Гвоздзеў (на чацвёртым месцы тут быў гросмайстар Аляксей Фёдараў).

На турніры ў Актобе (Казахстан; 95 гульцоў) Міхаіл Нікіценка заняў чацвёртае месца.

* * *

Прапаноўваем дзве партыі з мінулага чэмпіянату Беларусі ў першай лізе.

Яраслаў Навумовіч — Іван Пятрэнка. 1. Кf3 Кf6 2. d4 g6 3. g3 Cg7 4. Cg2 0-0 5. b3 d6 6. Cb2 b5 7. Kfd2 c6 8. c4 bc 9. K:c4 Фc7 10. 0-0 d5 11. Ke5 Kfd7 12. Kd3 e5 13. de K:e5 14. K:e5 C:e5 15. Кс3 Лd8 16. Лс1 Фе7 17. Фd2 Kd7 18. Ka4 Cb7 19. Лfd1 C:b2 20. Ф:b2 a5 21. e3 Лdc8 22. Лd2 Ca6 23. Лdc2 Фd6 24. Фd4 Фе6 25. Кс5 К:с5 26. Л:с5 Cb7 27. Фс3 a4 28. b4 a3 29. h4 h5 30. Крh2 Лd8 31. Cf1 d4 32. ed Ф:a2 33. Фf3 Ca6 34. С:a6 Л:a6 35. Фf6 Лe8 36. b5 Лaa8 37. bc Лe6 38. Фf3 Крg7 39. c7 Лс8 40. Л5с2, 1:0.

Аляксандр Алішэвіч — Ігар Люцко. 1. e4 c5 2. Kf3 e6 3. c3 d5 4. ed Ф:d5 5. d4 Kf6 6. Ce3 Кс6 7. Ка3 cd 8. Kb5 Фd8 9. Kb:d4 Kd5 10. К:с6 bc 11. Cd2 Фb6 12. b4 a5 13. a3 ab 14. ab Л:a1 15. Ф:a1 Ce7 16. Cd3 0-0 17. 0-0 Лd8 18. Фb1 g6 19. Лe1 Ca6 20. С:a6 Ф:a6 21. Фе4 Фа2 22. Лс1 Фb2 23. Фс2 Фа3 24. Лb1 Лb8 25. Kd4 Фа6 26. h3 Cf6 27. Kb3 Фе2 28. Лe1 Фс4 29. Ka5 Фа6 30. Kb3 Крg7 31. Лс1 e5 32. Кс5 Фс4 33. Фа4 Фе2 34. Фс2 Kb6 35. Ch6+, 1:0.

* * *

У Кітаі праходзіць матч на жаночае першынство свету паміж дзеючай чэмпіёнкай Цзюй Вэньцзюнь і яе суайчынніцай Лэй Цінцзэ. Мы яшчэ вернемся да гэтай тэмы.

* * *

Задача з мінулага выпуску (з чорнай пешкай на d7) рашаецца: 1. Kd5!, блізня (з чорнай пешкай на b7) — 1. Ке6! Правільна адказалі Ігар Ананіч, Аляксандр Зелянко, Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

Вадзім Жылко.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

ЗНАЁМСТВА З НАРОДНЫМІ ІНСТРУМЕНТАМІ

На сацыякультурным канале пачаў выходзіць цыкл відэароліка ў «Пачуй гісторыю, адчуй сучаснасць». У новым праекце тэлеканала «Беларусь 3» прадставяць сем рэдкіх беларускіх народных інструментаў, майстэрствам ігры на якіх валодаюць адзінкі.

Многія прыкметныя народныя музычныя інструменты знаёмы нам толькі як экспанаты экспазіцый краязнаўчых музеяў. Але прыгажосць і разнастайнасць беларускай музыкі заслугоўваюць увагі шырокай аўдыторыі. Менавіта таму творчая каманда тэлеканала «Беларусь 3» правяла сапраўднае фальклорна-этнаграфічнае даследаванне па вывучэнні і пошуку цікавых народных інструментаў.

«Мы задумаліся аб тым, як рэдка можна пачуць народныя беларускія інструменты са сцэны ці ў эфіры тэле- і радыёканалаў. Музыканты, якія валодаюць ігрой на народных інструментах, вельмі актыўна адгукнуліся на прапанову прыняць удзел у праекце «Пачуй гісторыю, адчуй сучаснасць». Некаторыя з іх прыязджалі на здымкі з іншых гарадоў па некалькі разоў, — адзначае **выканаўчы прадзюсар праекта Анастасія ЕРМАЛАЕВА.** — Не перастаюць здзіўляць таленавітыя суайчыннікі. Аляксандр Крамко, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, можа сыграць на ўсіх народных інструментах. У праекце ў яго выкананні прагучаць колавая ліра і парная дудка. Таксама ў відэароліках будуць прадстаўлены дуда, жалейка, акарына, саломка, цымбалы».

Перанесціся ў мінулае, пачуць аўтэнтычныя найгрышы і музыку беларускіх кампазітараў тэлегледачы могуць у эфіры і на YouTube-канале «Беларусь 3».

На адной хвалі

«Славянскі базар — 2023» — у тэлеэфіры

З 12 да 17 ліпеня горад на Заходняй Дзвіне прымае галоўны творчы форум — XXXII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Найбольш поўную культурную панараму мерапрыемства, канцэртных і конкурсных праграм у прамым эфіры прапануе тэлеаўдыторыі вялікая каманда Белтэлерадыёкампаніі. Яна правядзе ўсе фестывальныя дні разам з жыхарамі і гасцямі горада.

Традыцыйна ў дні форуму тэлеканал «Беларусь 1» пакажа сваім гледачам відэадзённікі фестывалю ў вячэрнім эфіры. А Агенцтва тэленавін правядзе прыхільнікаў «Славянскага базару» па ўсіх яго культурных пляцоўках. Тэматычнымі сюжэтамі будуць радаваць таксама ранішнія шоу «Добрай раніцы, Беларусь!» і «Добрай раніцы, Беларусь!» са Святланай Бароўскай».

Што да вялікіх канцэртных праграм, то сёння, 14 ліпеня, на сцэне Летняга амфітэатра збяруцца вядучыя артысты Беларусі і Расіі ў суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі імя М. Я. Фінберга і выступяць у канцэртнай праграме з цыкла «Саюзная дзяржава запрашае...», якая сёлета прысвечана 85-годдзю народнага артыста СССР Ігара Лучанка, і распачнецца яе прамая трансляцыя на тэлеканале ў 22.00. А ў выхадны, 16 ліпеня, не прапусціце на «Беларусь 1» прамую трансляцыю цырымоніі закрыцця XXXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» з удзелам любімых артыстаў.

Удзельнікі XXXII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск» у суправаджэнні Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Віталя Кульбакова 15 ліпеня выступяць з праграмай «Славянскі хіт» у рамках першага конкурснага дня. Падтрымаць каля тэлеэкранаў прадстаўніка нашай краіны Саміра Ялчыева зможам падчас прамой трансляцыі гала-канцэрта ў 18.30. У рамках другога конкурснага дня і ўрачыстага закрыцця фестывалю 16 ліпеня канкурсанты з праграмай «Сусветны хіт» выступяць на адной сцэне з запрошанымі артыстамі. І гэты канцэрт тэлеаўдыторыя пабачыць падчас трансляцыі на «Беларусь 1» у 21.30.

У сваю чаргу сацыякультурны тэлеканал будзе знаёміць сваю аўдыторыю з панарамай фестывалю. Напрыклад, карэспандэнты праекта «Навіны культуры» дапамогуць тэлеаўдыторыі адчуць атмасферу і рытм святочнага горада, пазнаёміцца з гасцямі і ўдзельнікамі культурнага форуму і наведаць яго галоўныя мерапрыемствы.

